Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Б 65 ац
7/1936
+

№ 22
лістапад
1936

Старшыня ЦВК БССР А. Г. Чарвякоў на Надзвычайным XII З'ездзе Советаў БССР робіць даклад аб праекце сталінскай Канстытуцыі СССР.

Работніца і калгасніца Беларусі

Выданне ЦККП(б)Б

БА 1415
Инв. 1953 г.

А. Жданаў

АБ СЯРГЕІ МІРОНАВІЧЫ КІРАВЕ

Два гады таму назад не стала нашага роднага Кірава, нашага Міроныча. Трыжды праклятая рука трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў спыніла жыццё бясстрашнага, палкага рэволюцыянера-большэвіка. Але яна не змагла спыніць нашага непераможнага руху ўперад.

У дні, калі совецкі народ абмяркоўвае сталінскую Канстытуцыю, у якой вогненнымі словамі запісаны перамогі соцыялізма, наш народ свята шануе памяць таго, хто аддаў усё сваё жыццё без астатку за перамогу ідэй Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна. Яго светлы вобраз будзе заўсёды прыкладам для працоўных, і памяць аб ім не пагасне навекі.

(„Праздa")

СЫН ВЯЛІКАЙ ПАРТЫІ

Таварыш Кіраў! Мала сказаць пра С. М. Кірава, што ён быў найлепшым таварышом, уважлівым і чулым, дзейсным і верным. Ён быў байцом асобага ранга за надыходзячы мір сапраўды таварыскіх адносін чалавека да чалавека, ён быў большэвіком - комунарам асобага складу. У штодзённым жыцці, на аратарскай трыбуне, на палях бітваў і ў змроках падполля, у жабрацкай абстаноўцы Томска і Тайгі і ў прасторным габінеце Смольнага — усюды, куды-б жыццё не закідвала таварыша Кірава, у любой абстаноўцы ён аставаўся чалавекам незгібаемага „нутра", спакойнай, бадзёрачай упэўненасці, верным сынам вялікай партыі Леніна-Сталіна.



І на ўсіх шляхах свайго жыцця ён перш за ўсё быў чалавекам асобага ўнутранага цяпла, да якога „цягнула" і ад якога ніхто не ўходзіў з пустымі рукамі, ніхто з шырачэйшага круга людзей яго таварыскіх сустрэч.

Слова Кіраў—магічнае слова для мільёнаў працоўных нашай радзімы. Кіраў—гэта не толькі гераічны сын найцяжэйшай нужды, плоць ад плоці мільёнаў такіх-жа, як ён, абяздоленых мас нашага нядаўнага мінулага. Кіраў—гэта гераічны вобраз перадавога барацьбіта за верныя шляхі жыцця для мільёнаў працоўных усяго свету, цудоўны ўзор той гіганцкай сталінскай сілы, якую нясуць з сабой гэтыя масы, калі яны стаяць на гэтых верных шляхах.

Кіраў—гэта не толькі выдатны трыбун пралетарскай рэволюцыі, самае слова якога была вялікай гістарычнай справай. Кіраў—адзін з тых нямногіх выбраннікаў ленінска-сталінскай кагорты правадыроў сусветнага пролетарыята, якія з асобым гонарам і славай неслі і нясуць на сваіх багатырскіх плячах сцяг Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, сцяг барацьбы за новы свет, свет радасны, шчаслівы і брацкі.

Гнусны забойца з наглай трацкісцка-зіноўеўскай банды вырваў з нашых радоў дарагога Сяргея Міронавіча. Гразная рука азвярэлых фашысцкіх агентаў абарвала цудоўнае жыццё Міроныча, жыццё, поўнае сіл і энергіі, жыццё бясстрашнага барацьбіта за справу соцыялізма, за справу партыі Леніна-Сталіна.

Страляючы ў Кірава, прадажныя падлюгі з фашысцкай ахранкі хацелі аслабіць сілы соцыялізма, хацелі ўнесці расстройства ў нашы рады. Але ворагі пралічыліся. Вялікая партыя большэвікоў, адным з правадыроў якой быў выдатны рэволюцыянер С. М. Кіраў, удзесяцярыла сваю энергію, згуртаванасць, класавую пільнасць.

Над свежай магілай Сяргея Міронавіча ўся партыя, увесь совецкі народ далі клятву:

раздавіць трыжды праклятую трацкісцка-зіноўеўскую банду, сцерці з твару совецкай зямлі азвярэлых, падлейшых з подлых агентаў фашызма;

з удзесяцяронай энергіяй несці вялікі сцяг Леніна Сталіна ўперад да канчатковай перамогі комунізма.

Г. Кржыжаноўскі.

(„Правда")

Родны бацька наш, мудры правадыр і настаўнік працоўных усяго свету, дарагі і любімы Іосіф Вісарыёнавіч!

Мы, дэлегаты Надзвычайнага Ўсебеларускага з'езда Советаў, шлем Вам, найвялікшаму правадыру народаў, арганізатару соцыялістычных перамог гарачае прывітанне ад шасцімільённага народу Совецкай Беларусі.

Несакрушальная цытадэль соцыялізма, узведзеная пад Вашым кіраўніцтвам, устае перад усім светам ва ўсёй велічнай прыгожасці, якая ўвасабіла ў сабе ўсю сілу геніяльнага чалавечага розуму, рэволюцыйнай волі, большэвіцкага прадбачання. Гэты розум, гэта воля і прадбачанне—Вашы, Іосіф Вісарыёнавіч!

Як ніколі магутны Совецкі Саюз! Як сонца над светам зяюць яркія агні нашай соцыялістычнай радзімы, надаючы мужнасць і сілу рэволюцыйным барацьбітам Іспаніі ў іх гераічнай барацьбе супраць азвярэлага фашызма, натхняючы шматмільённы кітайскі народ у барацьбе з японскім імперыялізмам, заклікаючы да вялікай вызваленчай барацьбы ўсе прыгнечаныя народы свету.

Увесь свет бачыць нашы перамогі і нашы поспехі. Яны асветлены найвялікшым пражэктарам свету—новай совецкай Канстытуцыяй, якая стала маяком для ўсяго чалавецтва, гэтай ні з чым не зраўнанай сапраўднай і вялікай хартыяй правоў чалавека і грамадзяніна. Аўтар гэтай Канстытуцыі—Вы, Іосіф Вісарыёнавіч. Ваша імя, таварыш Сталін, самае любімае, самае дарагое, самае роднае імя для ўсіх нас, для ўсіх народаў СССР, для рэволюцыйных барацьбітоў усяго свету.

Да Вас, нашага настаўніка, правадыра і друга зварачаюць свае радасныя погляды ўсе народы нашай краіны. На ўсіх з'ездах Советаў—ад Ціхага акіяна да нашых заходніх беларускіх граніц, ад горных вяршынь Таджыкістана да блакітных прастораў Арктыкі славяць Ваша імя, Іосіф Вісарыёнавіч, арганізатара найвялікшых сусветна-гістарычных перамог соцыялізма.

У цяжкія гады грамадзянскай вайны, у дні найвялікшых небяспек для нашага народу, Вы разам з Леніным, кіравалі стварэннем і абаронай нашай рэспублікі, стварэннем нашай слаўнай КП(б)Б, кіравалі ростам і росквітам Беларусі, прывялі яе ў рады ордэнаносных перадавых рэспублік Саюза. Упершыню ў гісторыі беларускі народ, у выніку перамогі Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі, заваяваў сваю дзяржаўнасць,—совецкай соцыялістычнай краіны. Непасрэдны тварэц гэтай дзяржаўнасці—Вы, Іосіф Вісарыёнавіч.

У гераічнай працы, у нашай барацьбе за соцыялізм выраслі дзівосныя кадры стаханаўцаў, ударнікаў, партыйных і не партыйных большэвікоў. БССР ганарыцца 74 ордэнаносцамі сельскай гаспадаркі, 35 ордэнаносцамі прамысловасці і транспарта. На лепшых людзей рэспублікі—Лучкоўскага, Скабло, Харнаса, Рушко, Батоўкіна, Ражкова, Блоцкага, Бейне, Клімовіча, Чэчыка, Зоню Рачок, Асадчага і многіх іншых раўняюцца зараз усе працоўныя Совецкай Беларусі. І гэтыя лепшыя людзі нашай рэспублікі—Вашы пітомцы, Іосіф Вісарыёнавіч.

Пад Вашым непасрэдным кіраўніцтвам, таварыш Сталін, Совецкая Беларусь стала квітнеючай краінай. Прамысловая прадукцыя Беларусі выраслa ў параўнанні з 1913 годам у дваццаць разоў. У БССР здабываецца больш 2 мільёнаў тон торфу. Наша варштатабудаўніцтва дае каля 10 проц. усёй прадукцыі Саюза. Удзельная вага прамысловасці ў народнай гаспадарцы Беларусі складае зараз 74 проц.

Усе гэтыя перамогі і дасягненні—перамогі Вашага кіраўніцтва, Іосіф Вісарыёнавіч.

Непазнавальна змянілася старая беларуская вёска з яе спрадвечным жабрацтвам і пакутамі беларускага селяніна. Магутныя камбайны і трактары апрацоўваюць шырокія калгасныя палі. Прасторы Совецкай Беларусі шумяць цяпер сваімі багатымі нівамі і пасьбішчамі і новыя людзі спяваюць шчаслівыя песні працы, славячы Вас, наш родны і мудры правадыр.

Калгасамі аб'яднана 87 проц. сялянскіх гаспадарак. Лямпка Ільіча ва многіх вёсках замяніла лучыну. За апошнія гады стада рагатай жывёлы павялічылася на 40 проц., пагалоўе свіней падвоілася. На балотах, якія раней былі крыніцамі пакут і няшчасцяў беларускага народу, створаны дзівосныя гаспадаркі. Асушана каля 700 тысяч гектараў балот.

Выраслі пасеўныя плошчы ільну, палепшана яго якасць. Лён—залаты фонд Беларусі. На палях Беларусі вырошчваюцца каучуканосы, канатнік і іншыя новыя тэхнічныя культуры.

За Вашы клопаты, за шлях, паказаны Вамі, які прывёў нас да велізарных перамог, за Вашы нястомныя думы аб нас падзяка Вам, наш дарагі бацька і любімы правадыр, Іосіф Вісарыёнавіч

Расце і мацнее беларуская культура, нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу. Бурны рост школ, стварэнне вышэйшых навучальных і навуковых устаноў, масавы выпуск газет і кніг, росквіт народнай творчасці, поспехі нашай літаратуры і мастацтва—усё гэта непарыўна звязана з Вашым імем, Іосіф Вісарыёнавіч.

Наш Совецкі Саюз, наша соцыялістычная дзяржава—гэта выдатнае сузор'е нацыянальнасцей, правобраз дзяржаўнага будаўніцтва для народаў усяго свету. БССР—неад'емная частка краіны Советаў. Толькі ў дружбе з усімі народамі, пры брацкай дапамозе і падтрыманні ўсяго Саюза і ў першую чаргу з боку рускага пролетарыята, наш беларускі народ вышаў на светлыя прасторы соцыялізма, заваяваў сваю дзяржаўнасць, свой матэрыяльны добрабыт, сваю культуру. Натхніцель гэтай вялікай дружбы народаў—Вы, Іосіф Вісарыёнавіч.

Мы абяцаем Вам, правадыр і настаўнік, працаваць яшчэ лепш, яшчэ больш клапаціцца аб патрэбах працоўных. Мы будзем з усёй цвёрдасцю ажыццяўляць новую Канстытуцыю—гэты сталінскі закон заможнага жыцця працоўных, яшчэ вышэй узнімем ролю Советаў—праваднікоў генеральнай лініі партыі. Як зяніцу вока будзем ахоўваць мы соцыялістычную ўласнасць, аснову совецкага ладу. Мы аб-

цаем яшчэ больш узняць рэволюцыйную пільнасць і так арганізаваць усю нашу працу, каб ніхто з ворагаў нават і думаць не пасмеў-бы пасягнуць на нашу краіну і жыццё нашых правадыроў. Ашалелыя сабакі з контррэволюцыйнага трацкісцка-зіноўеўскага атрэп'я думалі павярнуць назад кола нашай гісторыі. Забіўшы Сергея Міронавіча Кірава—палкага трыбуна народу, Вашага лепшага саратніка,—яны прабавалі ўзняць свае крывавыя рукі і супроць Вас, наш друг і настаўнік. Наша любоў да Вас, наша бязмежная адданасць справе соцыялізма—несакрушальны бар'ер, аб які разбіваюцца ўсякія спробы прэзрэнных ворагаў.

Наша сіла несакрушальная. Манеўры Беларускай ваеннай акругі наглядна паказалі, на што здольна наша непераможная Чырвоная Армія. Нашы граніцы закаваны ў сталь і бетон, іх ахоўваюць вучні жалезнага Фелікса—нашы слаўныя пагранічнікі. Наша армія моцная, і ні аднаго вяршка совецкай зямлі не ўзяць нікому. Гэта зямля дорага ўсяму працоўнаму чалавецтву і недаступна для ворагаў. Няхай ведаюць ворагі, што ў выпадку нападу на нас яны сустрэнуць грозную сілу, здольную не толькі адбіць атакі ворага, але і разграміць яго.

Совецкая Беларусь—магутны фарпост Совецкага Саюза на заходніх рубяжах. Калі Вы і партыя кінуць кліч,—мы рынемся жалезным патокам на ворага за вялікую справу партыі, за шчасце наша і нашых дзяцей, грудзьмі сваімі абаронім сваю зямлю. Няма такіх подвігаў, на якія не быў-бы здольны наш вольны гераічны народ.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! Мы гордыя і шчаслівыя, што з'яўляемся непасрэднымі ўдзельнікамі вялікай соцыялістычнай будоўлі і працуем пад Вашым геніяльным кіраўніцтвам. Ваша Канстытуцыя—мудрэйшае з усяго, напісанага ў вяках.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! Прыгожыя і здаровыя дзеці пяюць славу Вам, шчаслівыя мацеры пяюць славу Вам, увесь наш народ радасна і шчаслівa пяе славу Вам.

Прыміце, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, бязмежную любоў і адданасць ад сыноў беларускага народу.

Доўгія гады жывіце, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, на радасць усім працоўным і на страх ворагам.

Няхай жыве наша родная, любімая партыя Леніна—Сталіна!



На адкрыцці XII Надзвычайнага з'езда Советаў БССР. НА ЗДЫМКУ: у прэзідыуме з'езда тт. ГІКАЛО, ГАЛАДЗЕД, ЧАРВЯКОЎ, ВАЛКОВІЧ

ПРАМОВА тав. ЧАРВЯКОВА

НА АДКРЫЦЦІ XII НАДЗВЫЧАЙНАГА З'ЕЗДА СОВЕТАЎ БССР

Таварышы. XII Усебеларускі Налзвычайны з'езд Советаў склікан напярэдадні VIII Усесаюзнага з'езда Советаў для падвядзення вынікаў абмеркавання праекта сталінскай Канстытуцыі ў БССР і для выбару дэлегатаў на VIII Усесаюзны з'езд Советаў, які збіраецца для канчатковага зацверджання сталінскай канстытуцыі. Гэта надае работам XII Усебеларускага Надзвычайнага з'езда Советаў надзвычай важнае палітычнае значэнне і ўскладае на кожнага з нас, дэлегатаў з'езда, велізарныя гістарычныя абавязкі. Кожны з нас з гонарам адчувае высокае давер'е, якое аказана нам працоўнымі масамі Совецкай Беларусі, выбраўшымі нас у якасці дэлегатаў XII Усебеларускага Надзвычайнага з'езда Советаў для таго, каб выказаць думкі, волю і жаданне працоўных Совецкай Беларусі на пытанне аб праекце сталінскай Канстытуцыі; за правільнае вырашэнне дарученай нам задачы мы цалкам адказваем перад гісторыяй барацьбы за соцыялізм і перад працоўнымі Совецкай Беларусі.

У гэты надзвычайны гістарычны дзень, калі кожны з нас з хваляваннем прыступае да работы, адчуваючы сваю вялікую адказнасць перад працоўнымі, наша першая думка, як і думка ўсяго працоўнага беларускага народу, накіравана да натхняльніка, кіраўніка, настаўніка і друга беларускага народу — Вялікага таварыша

СТАЛІНА (Бурныя апладысменты. Воклічы „Ура!", „Няхай жыве тварэц Канстытуцыі, наш Вялікі СТАЛІН!", Магутнае „ўра!" Аркестр выконвае „Інтэрнацыянал").

Нашым першым словам да таварыша Сталіна з'яўляецца наш непарушны абавязак следваць заўсёды прыкладу таварыша Сталіна ў нашай барацьбе і ў нашым жыцці, быць вернымі змагарамі за справу соцыялізма, за справу Леніна—Сталіна.

У гэтыя гістарычныя дні ўся наша вялікая соцыялістычная радзіма, усе народы Совецкага Саюза з радасцю і гонарам вітаюць сталінскую Канстытуцыю, як вынік велізарных перамог ў барацьбе за соцыялізм і аснову далейшага неасяжнага соцыялістычнага росквіту і развіцця.

Асаблівую-ж радасць і гонар у гэтыя дні адчуваюць працоўныя Совецкай Беларусі: радасць і гонар за сваю вялікую соцыялістычную радзіму—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, за сваю перамогу ў барацьбе за соцыялізм, за новае радаснае жыццё, створанае на аснове перамог соцыялізма, стаўшае магчымым толькі ў выніку перамог Кастрычніцкай рэволюцыі і ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Совецкая Беларусь прышла да зацверджання праекта сталінскай Канстытуцыі СССР, ператварыўшыся з заняпалай, беднай, афяраванай на выміранне працоўных мас калоніі царызма ў Беларусь соцыялістычнай прамысловасці, соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, соцыялістычнай культуры мільёнаў актыўных і свядомых будаўнікоў соцыялізма, стаўшы роўнапраўнай неадрыўнай і перадавой часткай Вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Сталінская Канстытуцыя з'яўляецца трыумфам ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы якой працоўныя Совецкай Беларусі паўсталі з цемры мінулага і заваявалі сабе светлае і радаснае сучаснае.

У сталінскай Канстытуцыі працоўныя Совецкай Беларусі бачаць замацаванне дасягнутых перамог і залог далейшага развіцця.

Шчасце і радасць працоўных Совецкай Беларусі і Совецкага Саюза, значэнне сталінскай Канстытуцыі адчуваюцца з асаблівай сілай пры параўнанні становішча Совецкага Саюза са становішчам капіталістычнага свету, пры параўнанні разгорнутай пролетарскай дэмакратыі ў краіне Советаў і наглага разгулу раз'юшанага фашызма ў краінах капітала.

Мы добра ведаем, што сталінская Канстытуцыя з'яўляецца для працоўных капіталістычных краін праграмай, сцягам іх барацьбы за знішчэнне ўлады капіталістаў.

Усім сваім сэрцам мы з працоўнымі ўсяго свету, якія вядуць барацьбу за сваё вызваленне.

Мы шлем сваё палкае, баявое прывітанне рэволюцыйнаму іспанскаму народу, які вядзе гераічную барацьбу супроць азвярэлых фашыстаў і змагаецца за мір, за справу, якая з'яўляецца справай усяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва і жадаем іспанскаму народу рашучай перамогі над фашысцкімі бандамі. (Апладысменты).

Грозная сучасная міжнародная абстаноўка напамінае працоўным Совецкай Беларусі аб нашых асобых абавязках пагранічнай рэспублікі, баявога фарпоста Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным светам.

Мы шлем наша баявое прывітанне чырвонаармейцам, камандзірам, палітработнікам часцей Беларускай ваеннай акругі, усёй Чырвонай арміі і слаўнаму маршалу Совецкага Саюза другу беларускага народу таварышу Варашылаву. (Бурныя апладысменты. Аркестр выконвае „Інтэрнацыянал").

Мы асобна вітаем байцоў, камандзіраў, палітработнікаў, пагранічнікаў—тых слаўных пагранічнікаў, якія з дня ў дзень, з часу ў час доблесна выконваюць свае гераічныя абавязкі па ахове граніц Совецкага Саюза. (Апладысменты).

Воля працоўных Совецкай Беларусі папярэдне ўжо выказана. На сходах, пленумах советаў, раённых з'ездах советаў пры выбарах дэлегатаў беларускі народ **аднагалосна** прагаласаваў за сталінскую Канстытуцыю Саюза ССР (Апладысменты). Задача нашага з'езда—гэту волю выканаць.

Жаданне і воля працоўных Совецкай Беларусі накіраваны на тое, каб пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, па прыкладу і пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша СТАЛІНА (Апладысменты) сумленна і доблесна выконваць свае абавязкі перадавога атрада працоўных на мяжы з капіталістычным светам у барацьбе за соцыялізм, у барацьбе супроць усіх ворагаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы пачынаем сваю работу з імем вялікага правадыра прыгнечаных народаў усяго свету, вялікага тварца Канстытуцыі Саюза ССР таварыша Сталіна. (Апладысменты).

Пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, на чале з таварышам **Сталіным**, Совецкая Беларусь разам з працоўнымі ўсяго Совецкага Саюза дамаглася велізарных перамог.

Пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, на чале з таварышам **Сталіным**, Совецкая Беларусь разам з працоўнымі ўсяго Совецкага Саюза на аснове новай сталінскай Канстытуцыі яшчэ больш шпаркімі тэмпамі пойдзе па шляху соцыялістычнага развіцця.

Няхай жыве вялікая радзіма працоўных усяго свету—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік! (Апладысменты).

Няхай жыве кіраўнік і арганізатар нашых гістарычных перамог—вялікая партыя Леніна—Сталіна! (Апладысменты).

Няхай жыве правадыр працоўных усяго свету, наш кіраўнік і друг вялікі СТАЛІН! (Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Воклічы: „Ура", „Няхай жыве наш любімы СТАЛІН". Аркестр выконвае „Інтэрнацыянал". Авацыі ўзрастаюць з новай сілай. З усіх канцоў зала нясуцца воклічы гарачых прывітанняў у гонар партыі, у гонар вялікага СТАЛІНА).

XII Усебеларускі з'езд Советаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў агалашаю адкрытым. (Апладысменты, „Інтэрнацыянал").

Ураду вялікай краіны Советаў
І партыі, даўшай нам шчасце і мір,
За гонар, за веліч людскога расцвета
Падзяку прымі—дарагі правадыр!

(З пісьма беларускага народу вялікаму Сталіну).

МОЙ ШЛЯХ—ШЛЯХ МІЛЬЁНАЎ.

Мне выпаў на долю вялікі гонар разам са знатнымі людзьмі прымаць удзел у зацвярджэнні праекта сталінскай Канстытуцыі.

Няма слоў, каб выразіць маю радасць, маю любоў да таго, хто стварыў новую Канстытуцыю—да вялікага Сталіна, хто зрабіў нас, былых батракоў, самымі шчаслівымі ў свеце людзьмі.

Радзілася я па той бок граніцы, у Гродзеншчыне, на Белавежскіх балотах. Нямала паны і кулакі выпілі крыві ў мяне, бо я была дачка батрака. Бацька мой не меў кавалка зямлі. Дзень і ноч ён гнуў спіну на багацеяў. Ён меў сямёра дзяцей. Калі дзеці падрасталі, бацька нас таксама пасылаў да кулакоў працаваць.

З васьмі год давялося мне працаваць на памешчыкаў. Толькі здзекі, пабоі, холад, голад бачыла за сваю непасільную работу.

У 1915 г., у часе імперыялістычнай вайны, насельніцтва былой Гродзеншчыны прымушана была ўцякаць, сталі бежанцамі. Мы не мелі свайго каня, ды і бацька быў узяты на вайну і пакінуў матку з дзецьмі. Мацеры з дзецьмі прышлося пайсці пешшу. І яна ішла, колькі магла ісці, з малымі дзецьмі на руках.

Бежанкай дайшла я да Асвейскага раёна. Тут вышла замуж за такога-ж батрака, як і сама. Батрачылі ўдвух. Муж страціў здароўе на вайне і памёр ў 1929 г., пакінуўшы мне ўспадчыну толькі 4-х малых дзяцей.

Калі-б не совецкая ўлада—прапала-б я, удава, з малымі дзецьмі. Толькі совецкая ўлада паставіла мяне і маіх дзяцей на ногі, даўшы радаснае і заможнае жыццё, якім мы цяпер жывем.

З пачатку арганізацыі калгаса я, раздзетая, босая, без куска хлеба, уступіла ў яго. Адразу стала працаваць сумленна. У 1935 г. выпрацавала 532 працадні, у 1936 г. да кастрычніка—702.

На працадні я атрымала столькі розных прадуктаў, што іх на 2 гады хопіць маёй сям'і. У мяне раней не было каровы—цяпер я яе маю; раней у мяне ніколі не было парасяці—цяпер іх двое, ды аднаго закалола да свята Кастрычніка. Раней я не магла купіць жытняй мукі—цяпер я магу штодзённа пячы бліны і пірагі з пшанічнай мукі.

З 1932 г. я працую даяркай. 8 раз прэміравалі мяне за работу, у гэтым годзе ад 15 кароў надаіла я ў сярэднім па 3000 літраў. Мае каровы былі на раённай выстаўцы. Тут мяне таксама прэміравалі. Акрамя асноўнай работы даяркі я ў калгасе выконваю яшчэ абавязкі ветэрынарнага санітара. Маладняк у нас увесь захаваны.

Мне цяпер 33 год, але я адчуваю сябе намнога маладзейшай. Я адчуваю, што я жыву і мне хочацца жыць яшчэ многа. Рыхтуюся абараняць сваю новую радзіму. На выдатна здала экзамен на ПВХО, абагнаўшы свайго 18-гадовага сына—комсамольца, з якім спаборнічаю на лепшае аўладанне стралковай справай.

Я навучылася ўладаць вінтоўкай, каб без промаху біць таго, хто адважыцца парушыць нашы свяшчэнныя граніцы.

Цяпер мая заветная мара—убачыць таварыша Сталіна, і гэтага я даб'юся адданай працай у калгасе. Я хачу ўбачыць таварыша Сталіна, каб яму асабіста падзякаваць за клопаты аб жанчыне, аб людзях, за радаснае заможнае жыццё.

Калгас імя Калініна,
Асвейскага раёна:

Юлія Карпаўна Івашкевіч

Дэлегат XII Надзвычайнага з'езда советаў Беларусі.

Майстры вышывання: тт. П'яных Ольга—жонка інжынера бабруйскага лесакамбіната, Пуцейка Елена—студэнтка бабруйскага рабфака, Быкава Вера—калгасніца калгаса імя Варашылава Дрысенскага раёна вышываюць пісьмо беларускага народу вялікаму Сталіну.

Мой рапарт Надзвычайным З'ездам

Шэсць год прайшло з таго часу, як я ўпершыню выйшла з трактарам на калгаснае поле. Як цяпер помню гэты дзень...

Якая радасць! Машына, якая некалькі месяцаў назад была недаступнай, незразумелай,—падпарадкоўвалася малейшым рухам маёй рукі.

З тых пор, з 1931 г., і пачала я працаваць. Моцна палюбіўся мне трактар. Ён не ведаў паломак, ён у мяне не капрызнічаў. Я добра яго вывучыла.

У першы год работы, дырэкцыя МТС прэміравала мяне паездкай па СССР. Пабывала я ў буйных прамысловых цэнтрах Саюза і соўгасах. Гэта ўзбагаціла мой жыццёвы вопыт.

У 1932 г. мяне прызначылі брыгадзірам трактарнай брыгады.

Брыгада мая заўсёды перадавая. З году ў год яна перавыконвае заданні.

Я была дэлегаткай двух з'ездаў: VII з'езда Советаў і II усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў.

На гэтых з'ездах я бачыла роднага, дарагога таварыша Сталіна. Чула яго голас, адчувала яго ласкавы погляд.

Гэта здарэнне з'явілася пераломным у маім жыцці і рабоце.

Кіраўнікі партыі і ўраду, дэлегаты з'ездаў гаварылі аб вялікіх поспехах нашай соцыялістычнай радзімы. Гэтыя поспехі я параўнала са сваёй работай. Якімі мізэрнымі яны мне паказаліся! Я ўбачыла, як мы трактарысты БССР адстаем.

Прыехаўшы з Масквы членам саюзнага ўрада, я парашыла апраўдаць гэта пачэснае званне. З вялікім захапленнем узялася за работу. Але падумала, што нельга мне абмяжоўвацца толькі сваёй брыгадай. Гэта яшчэ мала, калі толькі мая брыгада будзе добра працаваць, трэба каб усе брыгады нашай ордэнаноснай рэспублікі былі перадавымі.

Вось я і напісала пісьмо да ўсіх трактарыстаў БССР праз газету „Звязда", прапанавала спаборнічаць за выпрацоўку на „ХТЗ" па 400 гектараў.

Шмат пісем у адказ я атрымала. Шмат трактарыстаў уключыліся ў спаборніцтва.

Мая брыгада ўспахала ў 1935 г. па 465 га на кожны трактар. Гэта выпрацоўка лічылася не малым паказчыкам па БССР, бо Наркамзем планіраваў у 1935 г. толькі па 265 га на трактар.

Але калі я паехала на нараду перадавікоў ураджайнасці ў Маскву і пачула аб выпрацоўцы Пашы Ангелінай, за свае „рэкорды" мне сорамна стала.

І як толькі звярнулася з Усесаюзнай нарады, узяла на сябе абавязацельства выпрацаваць 1100 га на трактар. Мяне падтрымалі трактарысты маёй брыгады.

Задоўга да выхаду ў поле, мы ўжо пачалі рыхтавацца да работы.

Былі падабраны плошчы зямлі для пахаты, прымацаваны сталыя падвозчыкі гаручага, плугавікі, праведзены вытворчыя нарады трактарыстаў, старшынь калгасаў—усіх, хто меў адносіны да работы трактара. Усё абгаварылі, як лепш арганізаваць работу, каб успахаць 1100 гектар кожнаму трактару.

У полі мая брыгада выйшла ў канцы сакавіка месяца. З першых-жа дзён работы брыгада пачала прымяняць стаханаўскія метады. Унутры брыгады разгарнулася спаборніцтва. Сама я, як брыгадзір, заключыла дагавор з лепшым брыгадзірам трактарнай брыгады Хоцімскай МТС, тав. Чэчэкам.

І барацьба за 1100 га пачалася.

Ужо з першых дзён работа спорылася. Трактарыст Петручэня выпрацоўваў па 8—12 га за дзень ворыва, засяваў па 40 га, а Пупейка ўзорваў па 20 га, не злазячы з трактара.

Кожны дзень увесь час знаходзілася я ў брыгадзе, на полі, там, дзе працавалі трактарысты. Дапамагала трактарыстам у рабоце, кіравала, старалася, каб была высокая выпрацоўка, эканомія гаручага і змазачнага матэрыялу.

Трактарысты па стаханаўску працавалі і культурна адпачывалі. Жонкі ІТР падрыхтоўвалі інтэрнаты ў калгасах, кухаркі варылі смачныя абеды. У брыгадзе мелася бібліятэчка-перасоўка. Трактарысты прачыталі такія кнігі: „Как закалялась сталь", „Я люблю", „Цемент", „Мать", „Тихий Дон" і інш. Усе яны выпісваюць і чытаюць газету „Звязда". Рэгулярна займаліся вывучэннем трактара, агратэхнікі. У брыгадзе сістэматычна праводзіліся гутаркі, палітінфармацыі.

Наша спаборніцтва мы правяралі, да мяне ў брыгаду прыязджалі з брыгады Чэчэка. У часе пасяўной брыгада Чэчэка мяне трохі абагнала. Мяне гэта зaела. Я рашыла не здавацца. Чэчэку я толькі сказала, што „цыплят па восені лічаць". А сама націснула яшчэ больш.

Упартая адданая работа ўсёй маёй брыгады дала свае вынікі. На 1 кастрычніка кожны трактар выпрацаваў па 1100 га. План нашай МТС перавыканан у 2,5 разы, эканоміі гаручага далі 8.000 кг. І ад Чэчэка не адсталі.

Сваё абавязацельства я выканала. Выканала таму, што на кожным кроку адчувала клопаты і дапамогу з боку раённай партыйнай арганізацыі і калгасаў. Акрамя таго свае абавязацельствы выканала таму, што я жыву ў краіне соцыялізма і працую на карысць любімай радзімы, дзе праца—ёсць гонар, адвага і геройства.

Але я лічу, што трактар мы яшчэ поўнасцю не выкарыстоўваем. Работу трэба арганізаваць яшчэ лепш. Ад тэхнікі трэба ўзяць больш, чым мы ўзялі.

Ад імя ўсёй брыгады на 1937 г. я бяру абавязак даць на кожны трактар не менш як 1500 гектар. І гэтага я даб'юся! Да гэтага мяне абавязвае высокая ўзнагарода, якой я ўзнагароджана—грамата Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта.

(Працяг на 6 стар. гуніва)

ГОНАР ЗА МУЖА

Вестка аб вышэйшай узнагародзе майго мужа ордэнам Леніна прынесла мне бязмежную радасць. Не верыла сваім вачам, калі чытала газетныя радкі. Ён —старшы лейтэнант N артылерыйскага палка. Да прызыву ў Чырвоную армію быў малапісьменны. У дзіцячыя гады вучыцца не мог, бо вялікая сям'я беднага селяніна не мела на гэта сродкаў. Жылі поўгалодныя, хлеба нехапала. Час вечнага жаху перад будучыняй змяніўся на час светлага і шчаслівага жыцця...

Радавы чырвонаармеец, затым малодшы камандзір батарэі, а цяпер старшы лейтэнант слаўнай Чырвонай арміі, узнагароджаны ордэнам Леніна.

Нялёгка дасталася яму званне ст лейтэнанта без адпаведнай адукацыі. Але Васіль сваёй энергіяй і настойлівасцю перамог усе цяжкасці. Неўзабаве ён атрымоўвае ганаровую назву—майстра меткага агню. Яго расказы аб выдатнай стральбе прыносілі мне адну толькі радасць.

Васіль шмат часу аддаваў сваёй



Тав. Пракоф'ева са сваёй дачкой.
Фота Піскуна

вучобе. Ён вельмі мала бывае дома. Спачатку я не разумела гэтую вечную занятасць яго, і шмат сумнявалася. Але гэтыя сумненні былі нядоўгімі. Цяпер я ўпэўнена, што мой Вася ўсе свае веды і здольнасці аддае свайму перадавому падраздзяленню слаўных байцоў—чырвонаармейцаў.

Для яго вучобы я стварыла ўтульнасць і спакой. Ён працуе, вучыцца, расце, а разам з ім расту і я.

Калі я вышла замуж за яго, то была адсталай жанчынай, слаба разбіралася ў грамаце. Пры дапамозе мужа я стала павышаць свой агульнаадукацыйны і ідэйнапалітычны ўзровень. Ужо магу самастойна разабраць прачытаны матэрыял.

Цяпер я буду яшчэ лепш вучыцца, каб быць вернай падругай мужа—ордэнаносца. Разам з ім буду вывучаць вайсковую справу, каб заўсёды быць гатовай да абароны сваёй цудоўнай радзімы.

Ад шчырага сэрца дзякуй совецкаму ўраду і роднаму Сталіну за высокую ўзнагароду мужа і наша шчаслівае жыццё!

Жонка ст лейтэнанта N артылерыйскага палка.
Н. М. Пракоф'ева.

Працаваць і перавыконваць новыя нормы выпрацоўкі мяне натхняе любоў да маёй соцыялістычнай радзімы, у якой я радасна і шчасліва жыву.

Дзе, у якой яшчэ краіне ёсць такія факты, калі былую батрачку, адсталую і няграматную, выхавалі ў знатнага чалавека!

Няма такой краіны! Гэта магчыма толькі ў нас, у краіне соцыялізма. Вось я цяпер член ЦВК БССР і СССР. Мяне за працу ўзнародзілі граматай ЦВК. А хіба я магла раней марыць аб гэтым! Не.

Памятаю, калі я працавала ў кулакоў. Працавала ад цямна да цямна, працавала непасільна, а хлеба не ела даволі, ды і глядзелі на мяне толькі як на працоўную жывёліну. Не лічылі нават за чалавека, бо я-ж батрачка. Бывала, на вечарынцы мяне не хацелі выбіраць у танцах, адварачваліся. Прыкра было. Часценька я думала, чым-жа я горш за іх? Але адказу не знаходзіла. Толькі моцную нянавісць затойвала ў сваім сэрцы супроць багацеяў.

Многа год гора і блукання па чужых вуглах закалілі мяне, выпрацавалі ў мяне цвёрды і настойлівы характар. За што не вазьмуся—хачу зрабіць толькі на выдатна.

Цяпер я жыву радасна і заможна. РВК будуе мне новую хату. У гэтым годзе я выпрацавала 1000 працадзён, за якія я атрымала 2.500 руб. грашыма і 3000 кг. зернавых. Усяго мне хапае.

І думкі ў мяне цяпер новыя, смелыя. Хачу вучыцца. Гэтую зіму буду з настаўнікамі рыхтавацца, каб мець сярэднюю адукацыю, а потым у інстытут.

Адначасова я рыхтуюся стаць членам комуністычнай партыі, каб усё сваё жыццё і сілы аддаць партыі, накіраваўшай мяне па яркаму і радаснаму шляху.

Копыльская МТС. **З. Рачок**

Инв. 1953 г. 24 415

ПРОВАДЫ

Сонца спускалася за лес. Надыходзіў вечар. Калгасніцы з вясёлымі песнямі звараціліся з поля. Сёння яны ўсе выглядаюць бадзёрымі, радуюцца, што закончылі своечасова ўборку бульбы і накапалі яе вельмі многа. Весялейшай за ўсіх выглядае Маруся. Пасля ўпартай дзённай работы яна зусім не адчувае стомы.

Прышоўшы дамоў яна, як і заўсёды, дагледзела жывёлу і ўзялася гатаваць вячэру.

Нервова, штомінутна яна бегала да акна і ўглядалася ў далячынь, дзе роўненькай істужкай цягнулася дарога ў МТС.

Яна сёння чакае свайго мужа, які працуе трактарыстам вось ужо тры гады... Вячэра прыгатавана, а Міколы не відаць.

Думка аб тым, дзе-ж ён мог дзецца, не давала спакою.

Маруся ўзяла кніжку і пачала чытаць. Не прайшло і пяці мінут як пачуліся крокі. Яна ў апошні раз глянула ў акно і ўбачыла постаць свайго мужа.

— Я ўжо думала, што ты не прыдзеш!—загаварыла Маруся, але падумала: як-жа ж так, заўтра трэба з'явіцца ў прызыўную камісію. Павінен прысці!..

Хутка распрануўшыся, Мікола паведаміў прычыну спазнення.

— Сёння ў нас быў агульны сход, на якім дырэктар гаварыў...

— Аб чым гаварыў? Хуценька раскажы!—перабіла Маруся.

— ...Аб тым, што я з'яўляюся лепшым стаханаўцам...

Стол быў устаўлены рознымі закускамі. І сала, і масла, і яблыкі, якія атрымала Маруся з калгаса ў лік аванса.

— Колечка,—прамовіла Маруся—усё, здаецца, ёсць. Жыццё маё сапраўды шчаслівае. Не дарма ажно жах ахутвае сэрца, калі тата і мама пачнуць гаварыць пра праклятае мінулае. А наша маладосць—маладосць прыгожая!

— Вось глядзі, чаго толькі у нас няма на стале! Ну, усё! Жывем па заможнаму,—і тут-жа гіранічна дадала:—не гледзячы на тое, што яшчэ маладыя гаспадары...

...Паліліся вясёлыя гукі гармоніка, на якім добра ўмее іграць Мікола, а Маруся голасна падпявала:

Я сядзела на дыване,
Вышывала платок Ваню...

* * *

Яшчэ зусім рана абудзіліся Маруся і Коля. Сёння—першы дзень прызыву. Маруся пачала завіхацца каля печы, а Коля пабег да свайго таварыша Алеся, каб ісці разам з ім.

Надзеўшы прыгажэйшыя касцюмы, два сябры ішлі да раённага цэнтра. Сяброўствам іх звязала сумесная работа ў МТС. Абодва яны—стаханаўцы. Ідучы па дарозе, яны з захапленнем дзяліліся думкамі аб тым, як трэба дабіцца яшчэ большай выпрацоўкі на трактары. Яны гаварылі пра Чырвоную армію і, асабліва, пра танкавыя часці. Абодва яны хочуць быць танкістамі.

... У прызыўнай камісіі перш чым аглядаць, камісар паклікаў іх да сябе ў габінет і паведаміў, што райваенкаматам яны прэміруюцца кожны па 150 рублёў.

— Годны!— такое заключэнне атрымалі абодва сябры.

Як радасна спаткала вестку Маруся аб тым, што яе муж залічаны ў рады РСЧА, у бронетанкавую часць!..

* * *

2220 рублёў грошай, 85 пудоў хлеба, 250 пудоў бульбы,—вось заробак стаханаўца Сокалава Міколы. Марусінай радасці не было канца. Думка аб тым, дзе дзяваць хлеб і грошы не давала спакою. Вот яно, заможнае жыццё!

* * *

Павольна пыхкаючы і набіраючы энергію, адыходзіў цягнік. Маруся і Коля ехалі ў горад Менск— ордэнаносную сталіцу Беларусі. Яны ехалі для таго, каб накупіць сабе розных рэчаў.

Маруся, не адрываючыся ад акна, усё думала Думала аб тым што купіць сабе і, галоўнае, каб абавязкова пайсці ў тэатр ці кіно. І калі паказаліся вялікія гмахі шматпавярховых дамоў, Маруся радасна сказала:

— Ужо Менск відаць!

... Дамоў зварачаліся на трэці дзень. А ў чамаданах ужо неслі дарагое паліто для Марусі, бацінкі і розныя пакупкі.

* * *

Самы радасны дзень. Сёння Коля ад'язджае ў рады Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. У гонар ад'езду ён спраўляе сямейную вечарынку. Марусі і яе сястры Ані, якая прышла на дапамогу, многа работы. Трэба-ж нагатовіць смачных закусак!

... У 7 гадзін прасторная хата запаўняецца моладдзю. Тут і дзяўчаты і хлопцы. Маладзенькая, чырвонашчокая Оля, каханка Алеся, таксама рада. Яна, як ніколі спрытна, выконвае кожны танец.

— Коля, змяні Сцёпку, пайграй сёння,—прыстаюць хлопцы і дзяўчаты.

Просьба задавальняецца... Мікола так прыгожа зайграў, што нават семідзесяцігадовая бабулька Арына пайшла ў скокі.

Позна весяліліся моладзь і старыкі ў гэты дзень.

І калі прабіла 11 гадзін і да памяшкання пад'ехаў аўтамабіль, усе прысутныя цёпла развіталіся з Міколам і Алесем.

Маруся, праводзячы, гаварыла:

— Як і тут, ты не пакідай упарта працаваць у РСЧА. Пільна ахоўвай свяшчэнныя граніцы нашай слаўнай радзімы, у якой, пад кіраўніцтвам любімага Сталіна, створана шчаслівае жыццё!

Калгас імя Гікало,
Клічаўскі раён.

А. Манькоў

Инв. 1953 г. 54 145

Пяцісотніцы

У сярэдзіне красавіка снег стаў быстра таяць. Тысячы ручаінкоў зажурчэлі на палях. Дырэктар соўгаса „Палажэвічы" тав. Жур прыехаў з Старых Дарог: быў даклад на прэзідыуме райвыканкома аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Ён жадаў найхутчэй паведаміць калектыў соўгаса аб прынятых рашэннях. Усе рыхтаваліся к сяўбе.

Не стаяла ў баку і Зінаіда Ануфрыеўна — жонка дырэктара соўгаса. Яна таксама энергічна рыхтавалася да веснавой сяўбы. Яшчэ ў мінулым годзе яна прачытала аб бліскучай перамозе Марыі Дземчанка, аб дасягненнях пяцісотніц, аб іх паездцы ў Маскву, аб гістарычным прыёме іх вялікім Сталіным у Крэмлёўскім палацы.

Звяно т. ЖУР змагаецца са шкодн камі, апрысквае бручку ручным метадам.

У Зінаіды Ануфрыеўны ўзнікла думка арганізаваць звяно пяцісотніц у сябе ў соўгасе. Зінаіда Ануфрыеўна падзялілася сваімі думкамі і жаданнямі з другімі жонкамі работнікаў соўгаса, заклікаючы іх на барацьбу за высокі ўраджай, за 500 цэнтнераў кораньплодаў з гектара. Яе горача падтрымалі Верамеява, жонка механіка, Якубовіч — жонка бухгалтара, Архіпенка — жонка жывёлавода і іншыя. Так было створана першае звяно пяцісотніц соўгаса „Палажэвічы".

Зінаіда Ануфрыеўна ад імя свайго звяна ўзяла абавязацельства апрацаваць участак у 4 гектары, засеяць і атрымаць ураджай у 500 цэнтнераў з гектара. Некаторыя работніцы і рабочыя, слухаючы яе, недаверліва ківалі галовамі, бо да гэтага часу ў соўгасе атрымоўвалі не больш 200 — 275 цэнтнераў з гектара.

Хутка звяно вышла ў поле.

Адведзены ўчастак быў вельмі засмечан пырнікам. 25 вазоў карэнняў пырніка звезла звяно. Дробна разбівалі гной, без агрэхаў запахалі.

Звяно апрацоўвала і засявала па 0,67 га ў дзень замест 0,50 га. Сеялі ў дождж, добра змочаным насеннем.

Хутка ў соўгасе было арганізавана яшчэ 2 звяны пяцісотніц—з хатніх гаспадынь, жонак рабочых. Кожнае звяно ўзяла на сябе абавязак—апрацаваць, пасеяць і ўбраць па 2 га кораньплодаў.

Звеннявая 2-га звяна, Варвара Матусевіч, жонка старшыні рабочкома соўгаса, звенневая 3-га звяна, Мазуркевіч Надзежда жонка шорніка і тав. Жур заключылі соцдагаворы паміж звеннямі, абавязаўшыся працаваць, як Марыя Дземчэнка і дабіцца на соўгасных палях сталінскіх ураджаяў кораньплодаў.

Зінаіда Ануфрыеўна ЖУР.

3 мая сяўба была скончана. На 4-ы дзень на палях паявіліся дружныя ўсходы бручкі і кармовых буракоў.

Неспадзявана наступілі гарачыя летнія дні. На працягу 1½ месяцаў не выпала ні адной каплі дажджу. Пышная зелень кораньплодаў вяла, жаўцела, засыхала на карні. А туг яшчэ з'явілася земляная блыха, якая паражала яшчэ незавяўшыя расліны.

Зінаіда Ануфрыеўна рашуча паставіла перад пяцісотніцамі задачу выратаваць усходы ад засухі, без адкладна пачаць паліўку кораньплодаў. Пачалі вазіць сотні бочак вады на участкі з буракамі і бручкай. Тысячы вёдзер вільгаці жадна ўсмоктвала трэскаючаяся ад гарачыні зямля. Праз тыдзень пасля паліўкі зрабілі падкормку ўсходаў раствором гнаёвай жыжкі. Пасля пачалі праполку, прарыўку і падсадку на месца згінуўшых раслін. 6 раз палівалі звенні пасевы бручкі 14 разы буракі. Кораньплоды былі выратаваны.

Чытка газет у час абедзенага перапынку ў звяне т. ЖУР.

Соцдагаворы прагаралася звеннямі ўзаемна ў штодзенній рабоце. Вынікі праверкі асвятляліся ў соўгаснай насценгазеце і ў раённай газеце „За калектывізацыю". Уперадзе ішло звяно Зінаіды Ануфрыеўны. Не адставалі і іншыя звенні.

У ліпені на плантацыях пяцісотніц з'явіліся тучы матылёў—бялянкі. Матылі пачали люта знішчаць бручку. Замест зялёных лісточкаў на бручцы тырчэлі адны шкілеты з тоненькіх жылак.

Пяцісотніцы разгарнулі бязлітасную барацьбу са шкоднікамі: апырсквалі бручку атрутнымі растворамі, апыльвалі парашком, збіралі чарвей рукамі і знішчалі іх. К канцу жніўня шкоднікі былі знішчаны. Кораньплоды пачалі хутка расці

Звяно т. ЖУР за ачысткай ураджаю бручкі ад ботвы.

Увосень прыступілі да ўборкі ўраджаю. І тут пяцісотніцы ўбачылі вынікі сваёй работы: ураджай у сярэднім дасягнуў 550 цэнтнераў, а бручкі—600 цэнтнераў з 1 га.

Зінаіда Ануфрыеўна праводзіла і грамадскую работу. Яна разгарнула шырокую культасветную работу ў сваім звяне: штодзённа ў абедзены перапынак Зінаіда Ануфрыеўна раволзіла чытку газет. Глыбока прапрацавалі закон аб забароне абортаў і дапамозе шматсямейным, праект сталінскай Канстытуцыі і іншыя важнейшыя рашэнні партыі і ўраду. Быў арганізован збор сродкаў у дапамогу жанчынам і дзецям гераічнага іспанскага народу.

Усе 16 пяцісотніц—члены ячэйкі АСО; у іх арганізован жаночы стралковы гурток, які рэгулярна па выхадных днях занімаўся стральбой. З мелкакалібернай вінтоўкі тав. Шпілеўская з 15 магчымых ачкоў выбіла ўсе 15, а т. Жур—14.



Звяно на стралковых занятках Асоавіяхіма.

Арганізован таксама гурток Чырвонага крыжа. Гурток узмоцнена рыхтуецца да здачы норм на значок ГСА.

Першае звяно пяцісотніц узяло шэфства над дзіцячымі яслямі і дзіцячым садам соўгаса. Тав. Жур сабрала ўсіх жанчын-матак. На гэтым сходзе былі ўскрыты ўсе недахопы ў рабоце дзіцячых устаноў соўгаса. Загадчык яслямі атрымала рад практычных указанняў, каб знішчыць маючыяся недахопы.

Зінаіда Ануфрыеўна разгарнула ў соўгасе работу драмгуртка: жонкі ІТР т. т. Верамеева, Якубовіч, Бука і інш. з'яўляюцца актыўнымі членамі гуртка. Яны прымаюць таксама ўдзел і ў мастацкай самадзейнасці падшэфнай вайсковай часці.

Так працуе ўдзельніца ўсебеларускай нарады жонак ІТР работнікаў соўгасаў і МТС тав. Жур.

Кудзінаў

АКРУЖЫМ СПАЧУВАННЕМ

Выконваем свой рэволюцыйны доўг

Глыбока ўсхвалявалі падзеі ў Іспаніі работнікаў нашай фабрыкі. Гэтае пытанне ў нас не сходзіць з парадку дня. Аб ім гавораць на гуртках, аб ім гавораць агітатары ў сваіх гутарках, аб гэтым у абедзеныя перапынкі чытаюць з газет.

І кожны раз работніцы з хваляваннем выслухоўваюць інфармацыі аб падзеях у Іспаніі. Кожны раз яны выражаюць сваю салідарнасць з гераічным іспанскім народам.

Калі быў арганізован першы раз збор сродкаў, мы сабралі звыш 3000 руб., у тым ліку 50 руб. сабрана сярод жонак ІТР.

Нядаўна ў нас праходзілі мітынгі па ўсіх цэхах і зменах. Работніцы горача віталі выступленні прадстаўнікоў нашага ўраду тав. Кагана і Майскага супроць фашысцкай інтэрвенцыі. Яны рашуча патрабавалі пакончыць з камедыяй „неўмяшацельства". Яны патрабавалі сапраўднага неўмяшацельства фашысцкіх катаў ва ўнутраныя справы Іспаніі

Увесь паўтаратысячны рабочы калектыў пастанавіў адпрацаваць адзін выходны дзень у карысць жанчын і дзяцей Іспаніі і штомесячна, да поўнай перамогі іспанскай рэволюцыі, адлічаць у карысць гераічнага іспанскага народу поўдзённы заработак.

Свае пастановы работніцы правялі ў жыццё. 24 кастрычніка ў выходны дзень уся фабрыка работала. Гэта быў незвычайны дзень. Работніцы працавалі з вялікім энтузіязмам, стараліся больш выпрацаваць, даць найлепшую якасць прадукцыі.

Стаханаўка Давідовіч выканала ў гэты дзень план на 190 проц., Шапіра—150, Падаставец—150.

— Я з вялікай ахвотай працавала ў гэты дзень, — кажа тав. Шапіра.—Я адчувала, што мы робім вялікую справу, падтрымліваючы іспанскіх таварышоў.

— Хто-ж дапаможа іспанскім працоўным, калі не мы, пролетарыі краіны Советаў!—гаварыла брыгадзір Падаставец Рыва.— Мы яшчэ памятаем жудасці грамадзянскай вайны, таму мы так чула адгукаемся, бо ведаем, як мучаюцца нашы іспанскія сёстры і дзеці.

За гэты дзень работніцы і рабочыя зарабілі звыш 7000 руб. Грошы пераведзены на рахунак Дзяржбанка ў фонд дапамогі жанчынам і дзецям Іспаніі.

Е. ЭПШТЭЙН.

Фабрыка „Комунарка"

Менск.

Верым у вашу перамогу

Мы, жанчыны м. Прапойска, сабраліся на пленум м/совета прысвечаны падагульненню вынікаў абмеркавання сталінскай Канстытуцыі і работы м/совета.

Сваю работу пленум пачаў з асвятлення апошніх падзей у Іспаніі. Прамова старшыні м/совета аб падзеях у Іспаніі моцна ўсхвалявала нас.

Мы, вольныя жанчыны Совецкай Беларусі, шчаслівыя ў сваім жыцці, балюча адчулі ў гэты момант усю цяжкасць барацьбы нашых іспанскіх сясцёр за-сваё вызваленне з-пад гнёта фашызма. І на прапанову аб зборы сродкаў мы унеслі сваю дапамогу. Мы, жанчыны — удзельнікі пленума, сабралі 170 руб.

Мы, жанчыны свабоднай краіны, ганарымся сваімі правамі і жадаем, каб нашы замежныя сёстры, гераічныя іспанкі, як найхутчэй атрымалі такое-ж свабоднае і шчаслівае жыццё. Нас радуе, што нашы браты па класу, працоўныя Іспаніі, так гераічна і смела абараняюць сваю свабоду.

Мы ўпэўнены, што перамога будзе за іспанскім народам, бо ён змагаецца за свабодную дэмакратычную Іспанію!

Прапойск

Прося Колечкова.

Брацкае прывітанне рабочым і сялянам Іспанскай дэмакратычнай рэспублікі, якія вядуць гераічную барацьбу супроць фашызма!

На здымку: Забітыя дзеці пры бамбардыроўцы Мадрыда фашысцкімі самалётамі.

(Саюзфота)

І ДАПАМОЖАМ ІСПАНСКАМУ НАРОДУ

У СЭРЦАХ КЛІЧ ІБАРУРЫ—ГЕРОЯ

Ноч. І надзеяй
Сагрэт верхавы.
Смелы—не ведае страху;
Думае—толькі-б
Праскочыць равы,
Пераплысці праз Тахо.

Можа ўспомніла
Жонка яго
з любай дачкой яснавокай:
Скалы-ж—вышыні
Астурыйскіх гор—
Недзе далёка, далёка.

Вызналі цемень
Іспанскіх дарог
Тысячы слаўных імёнаў.
... Што гэта?
Сочыцца свежая кроў,
Выпалі ногі з страмёнаў.

І па-над цёмнаю
Тахо ракой
Звіслі цямнейшыя хмары.
Смерць,
Падасланая катам Франко,
Цешыцца новай афярай.

Тахо...
І шум, і густыя кругі,
Узбураны цёмныя воды.
Верны-жа будзь,
Друг баёў дарагі,—
Словы ад сына народу.

Тахо пазадзе,
Бераг ізноў.
Конь не імчыць па ўхабах:
Друг-верхавы
Памірае ля ног
На поўдарозе ад штаба.

Шаснулі зблізку
Трывожна кусты.
Голас... такі не забыты...
—Любая! жонка!
Значыць, і ты
Разам са мною на бітве!

Покуль займаецца
Ранішні свет,
Ты пяройдзеш узгор'і..
І паміраў ён спакойна—
пакет
Будзе дастаўлены ўпору.

Што там і цемень
І далячынь—
Стрэлы сустрэчнага бою,—
У сэрцах іспанак
Герояў-жанчын
Кліч Ібаруры-героя.

І не загіне народ,
Будзе жыць,—
Верыць Іспанія цвёрда:
Мацеры, сёстры,
Браты і мужы
Знішчаць мяцежнікаў орды!

Шавель

Мы з вамі дзеці Іспаніі

У школе амаль кожны дзень апавядаюць нам пра падзеі ў Іспаніі. Усе вучні сочаць за гераічнай барацьбой іспанскага народу. Мне вельмі шкада няшчасных дзяцей—нашых таварышоў. Іх бацькі, браты, сёстры і маці змагаюцца з фашыстамі, за прыгожае і шчаслівае жыццё для сваіх дзяцей.

Працоўныя ўсяго свету вераць у перамогу гераічнага іспанскага народу над крывавымі фашыстамі. Матэрыяльная і маральная дапамога ўсіх працоўных натхняе іспанскіх рэвалюцыянераў на адвагу і гераізм.

У нашай школе таксама збіралі грошы ў фонд дапамогі жанчынам і дзецям Іспаніі. Я ўнесла 5 руб. Вельмі задаволена тым, што маю магчымасць паслаць сваім таварышам невялікую дапамогу.

Нам, шчаслівым дзецям шчаслівай краіны, жыць стала весела. Правяла я летнія канікулы вельмі добра. Была ў піонерскім лагеры. Прачытала шмат цікавых кніжак: „Як гартавалася сталь" Н. Астроўскага, „Рыжык" Свірскага, пра чэлюскінцаў, „Унук камунара" і інш. Усе гэтыя кніжкі мне спадабаліся. У лагеры было вельмі весела. З таварышамі праводзіла розныя цікавыя гульні, купаліся, хадзілі ў лес, спявалі прыгожыя і вясёлыя песні.

Вялікае піонерскае дзякуй любімаму другу дзяцей, роднаму **Сталіну** за шчаслівае дзяцінства! Я ўпэўнена, што гераічны народ Іспаніі заваюе для сваіх дзяцей такое-ж шчаслівае жыццё.

Вучаніца Вера Ладысава.

г. Віцебск.

Няхай жыве гераічны іспанскі народ!

Работніцы фабрыкі Трохгорная мануфактура імя Дзяржынскага (Масква) адпраўляюць сем'ям байцоў рэспубліканскай Іспаніі індывідуальныя пасылкі з бялізнай і адзежай.

На здымку: стаханаўка ткачыха З. Лісінава піша суправаджальнае пісьмо да пасылкі. (Саюзфота)

Радасць сям'і

У хаце было шумна. Рослая жанчына з доўгімі, цёмнарусымі касамі, у паласатай сукенцы, сядзела на жоўтым тапчане і, прыхінуўшы да сваіх грудзей невялічкую з круглень-кім, ружовенькім тварыкам дзяўчынку, у натхненні песціла яе.

Яна гладзіла белакурую галоўку дачуркі і салодка цалавала яе прыгожанькі лобік.

Невялічкая Маруська ёрзала на матчыных каленях, часам цаплялася за яе прадаўгаваты з гарбінкаю нос, і тады, як тая сінічка, шчабятала ў захапленні.

Чарнявенькі хлопчык выстраіў у шарэнгу брацішак і, ушчаміўшы паміж ног чапялу, нібы на кані, вярхом пад'язджаў да шарэнгі, да ілба прыкладаў ручку і, быццам кавалерыйскі начальнік, вітаўся з байцамі.

Яны дружна крычалі:

— Дзень добры!—І зноў разбягаліся па хаце.

З-за вялікай пабеленай печы пачуўся гудок, і дзеці ўсе як адзін размясціліся ва ўмоўленым месцы.

Чатырохгадовы, віхрасценькі Міша падаўся да „танка". Ён улез у чамаданчык, крышкай прыкрыў галаву і, абапіраючыся ручкай аб падлогу, загрукацеў да стала.

У вугле стракатаў „кулямёт". Папяровы голуб, як той самалёт, спавіты сонечнымі праменнямі, узвіўся над галовамі. Тады маленькі Грыша зірнуу угору і, захліпваючыся ад візгу, пачаў „адступаць" пад стол.

Праз колькі маўклівых хвілін хтосьці зарагатаў пад услонам, і яны ўсе як адзін высыпалі на хату. Толькі маленькі Грыша яшчэ раз зірнуў з-пад стала.

Ля сяней зафыркаў конь, і дзеці адразу кінуліся да вокнаў. З тапчана ўзнялася і матка. Яна пасадзіла Маруську на ложак, а сама, спяшаючыся, затупала па хаце і, прыбіраючы барыкады, штосьці забурчэла на дзяцей.

Чалавек у шэрым паліто саскочыў з сядла Каня прывязаў да жэрдкі, а сам пачаў падніматца на ганак.

— Дзядзя прыехаў!—у адзін голас закрычала дзетвара.

Ён увайшоў у хату, падышоў да жанчыны, шчыра паціснуў яе цёплую далонь і, прыветліва ўсміхнуўшыся, звярнуўся да дзяцей:

— А дзе-ж бацька?

— Зараз прыдзе,—хутка адказаў чарнявенькі хлопчык і адразу падсунуў зэдлік старшыні.

Старшыня падзякаваў за ўвагу хлопчыка, расшпіліў паліто і апусціўся на зэдлік.

Віхрасценькі Міша, ссунуўшы броўкі, вочкамі пакасіў на дзядзьку і нерашуча пайшоў да лежаўшага на ўслоне партфеля. Яго цікавілі бліскучыя замочкі і яму вельмі хацелася дакрануцца да іх.

Старшыня сельскага совета рукой павёў па яго мякенькіх ускудлычаных валосіках, дастаў з кішэні цукерку і пачаставаў хлапчука.

Вясёлы і прыветлівы мужчына ўвязаўся ў дзяціную гаворку, і жанчыне было цяжка ўявіць, па якіх-жа справах у хату з'явіўся гэты чалавек. Яна хацела было запытаць у яго, але стрымалася, рашыла пачакаць і, падазваўшы Колю, ціха сказала яму:

— Збегай за татам.

Праз колькі хвілін услед за запыхаўшымся хлопчыкам пераступіў парог і каранасты, шырокаплечы гаспадар.

На яго твары, дзе-ні-дзе былі відаць ужо крыху пасівеўшыя валасы, а з-пад густых, як шчотка, брывей выглядалі яго вялікія, вясёлыя вочы. Ён цвёрда ідзе па хаце, падыходзіць да старшыні, павітаўшыся, садзіцца каля яго.

Цяпер завязалася цікавая гаворка. Здавалася-б, што нібы нераззлучныя сябры, пасля доўгіх дзён нябачання, расчуленыя цікавымі падзеямі жыцця, жвава гаварылі...

На дварэ пачынала цямнець. Вялікі гурт калгасных кароў мерна крочыў па вуліцы, а белагрывы конь заірзаў ля акна.

— Дык прыехаў я спецыяльна да вас, Ірына Міхайлаўна,—пачаў старшыня.—Вам, як шматсямейнай...—прадаўжаў ён, не зводзячы вачэй з твару жанчыны.

Жанчына настаражылася. Па яе смуглым твары папоўз яркі румянец, забілася сэрца.

Старшыня ўзняў з услона партфель, адчыніў замочкі і, выняўшы невялічкую паперку, якая была даслана Ірыне Міхайлаўне Советам Народных Камісараў, зачытаў ёй уголас.

Усхваляваная ад радасці жанчына захадзіла, замешкалася сярод сваіх любімых дзяцей і, схапіўшы Маруську ў ахапак, пачала горача цалаваць яе прыгожанькі тварык.

Ірына Міхайлаўна доўга не клалася спаць. Расчуленая, яна сядзела на ложку, засланым пушыстай коўдрай і, гаворачы з мужам, часта пазірала на салодка спаўшых дзяцей. У хаце было ціха. Толькі чутна было як на печы, выцягнуўшы лапкі на ўскрай, заплюшчыўшы вочы, ласкава мурлыкаў шэры вусаты кот, а на дварэ ад невялічкага подыху ветру ціха шапацелі кляновыя лісці

Залацістай асенняй раніцай, калі з-за высокай сілоснай вежы ў небе высілася яркае сонца, ля Ірынінай хаты загрукацелі калёсы. Яна зірнула ў акно. На калёсах сядзеў малады кучаравы

хлапец. Яна хутка апранула дзяцей, адправіла іх з старэйшым хлапчуком у сад, з шуфляды вынула сваё цёмнасіняе з пушыстым лісіным каўняром, паліто і, надзеўшы яго выйшла на ганак.

Чубасты хлапец падаў Ірыне руку, і яна села на калёсы.

Вараны рысісты конь затрусіў па дарозе. Надвор'е было яснае. Касыя яркія праменні сонца ўсцілалі густую асеннюю рунь. Вялікія гурты тлустай калгаснай жывёлы спрытна згрызалі асеннюю траву.

Яшчэ здалёку было відаць, як з высокіх заводскіх труб над вялікімі гарадскімі будынкамі плыў густы шэры дым. Ён высока ўздымаўся ўгору і там у чыстым блакітным небе знікаў ў паветры.

На шырокай замошчанай вуліцы шурхацелі машыны. Кучаравы хлапец пад'ехаў да вялікага дому, і Ірына Міхайлаўна пачала ўздымацца па лесніцы.

У калідоры яе сустрэў пажылы высокі чалавек з гладка прычэсанымі ільнянымі валасамі. Ён паглядзеў на жанчыну і, бачачы, што яе карыя вочы нерашуча бегаюць па шматлікіх дзвярах райвыканкому, суняўся і запытаў у яе:

— Вы да каго?

Ірына Міхайлаўна зашавяліла рукамі, з-за пазухі выцягнула завязаную ў беленькую хустачку паперку і падала чалавеку.

Чалавек вачыма павёў па паперцы і папрасіў яе зайсці ў габінет.

За сталом у крэсле сядзеў старшыня. Ён гаварыў з нейкім барадатым чалавекам, апранутым у сівую суконную світку. Яшчэ некалькі чалавек сядзела ля сцяны.

Старшыня ўзняўся з-за стала, павітаўся з Ірынай і запрасіў яе сесці.

Ірына Міхайлаўна спачатку зірнула на крэсла, затым прыпадняла палу паліта і, камечачы ў жмені хусцінку, апусцілася на краюшак крэсла.

— Дык пачнем,—зірнуўшы на гадзіннік, прапанаваў старшыня.

— Першае аб Ірыне Міхаўлаўне...

Прысутныя адразу звярнулі ўвагу на сядзеўшую на краюшку крэсла жанчыну, і было відаць, як па яе цмянаму твару ад хваляванняў зноў папоўз румянец.

Ірына Міхайлаўна варушылася на крэсле, папраўляла хусцінку, а палкія словы старшыні ўсё больш і больш хвалявалі яе...

Вось ён узняў са стала некалькі акуратна складзеных пакецікаў і паднёс да Ірыны.

— Вам за дзесяць слаўных...

Ірына Міхайлаўна працягнула свае шырокія, працавітыя далоні, узяла акуратна складзеныя ў пакецікі чатыры тысячы рублёў, прыхінула да сябе і на яе прыгожых усхваляваных вуснах загуляла вясёлая ўсмешка.

Ёй хацелася шмат аб чым сказаць у гэты незабыўны час яе радаснага жыцця. Паціскаючы руку старшыні, з расчуленай сардэчнай глыбіні ў пакоі прагучэлі яе гарачыя шчырыя словы:

— Вялікае, палкае дзякуй нашаму любімаму Сталіну за яго бацькаўскія клопаты!

Калгас Большэвік,
Менскі раён

А. І. Стаховіч.



Калгасніца калгаса „Прагрэс", Уздзенскага раёна Махнач Ксенія Іванаўна маці 11 дзяцей, атрымаўшая дзяржаўнай дапамогі ў суме 9.000 руб.

НАМ ПІШУЦЬ

АЎГІННЯ АСТАПАВА

Аўгінню Астапаву ў калгасе імя Сталіна ведаюць як працавітую, скромную жанчыну. У пачатку 1936 г. на агульным сходзе пры выбарах адказнай па ільну, усе застанавіліся на Астапавай.

— Хто як не яна, падыходзіць да гэтай работы,—гаварылі калгаснікі.

Добра ведаючая ільнаводчую справу, яна выдзялялася сярод іншых калгасніц. З вялікай ахвотай і любоўю ўзялася Астапава за сваю работу па догляду за лёнам.

Радаваліся сэрцы калгаснікаў як рос лён. Ён прыцягваў увагу кожнага, хто толькі праходзіў каля ільнянога масіву. 70-гадовы стары Васільеў Герасім, убачыўшы лён вышынёй у 1,20 метра, заявіў:

— Гэта-ж трэба, які добры вырас, я яшчэ такога ільну не бачыў, дый дзяды нашы не мелі такога ільну. Вось што значыць ранняя сяўба, добрая апрацоўка і клапатлівы догляд!

У сярэдзіне ліпеня лён стаў набываць васковы колер. Распачалі цераблення Хутка яго выцерабілі і разаслалі. Асаблівыя ўзоры работы паказалі калгасніцы Карытка Фёкла, Чэпікава, Пацанкова Аўгіння, Феськовы Анюта і Вася, Угалькова Алена, Астапава Аўгіння і Наста. Яны норму перавыконвалі ў 2 разы. Тэмпы не былі здадзены на малацьбе і пры рассціле.

Пільны кантроль быў пастаўлен за вылежкай ільну. Астапава хадзіла на сцелішча, аглядала як вылежваецца траста, папраўляла ад ветру.

Своечасова паднялі трасту са сцелішча. Асаблівую ўвагу звярнулі на сартаванне трасты. Сартавалі ў час цераблення, рассцілу і пад'ёму. Сартавалі па даўжыні і таўшчыні сцяблоў, па колеру.

Перад адпраўкай на ільназавод добра аправілі трасту. Здалі яе 3—2,5 нумарам.

Лён у калгасе заваяваў пачэснае месца. Калгаснікі палюбілі гэту культуру, аддаюць ёй вялікую ўвагу.

...У канцылярыі калгаса вісіць табель работ. З усяго спісу вылучаецца сям'я Астапавай. Трое працаздольных у сям'і выпрацавалі за 9 месяцаў больш 1000 працадзён.

Сталінскія словы „жыць стала лепш, жыць стала весялей" на справе ажыццявіліся ў сям'і Астапавай. Хлеба, сала і іншых прадуктаў цяпер хапае. Аўгіння не марыла аб такім шчаслівым жыцці, якога яна дабілася упартай і добрасумленнай працай. Неахвотна ўспамінае Аксіння аб мінулым жыцці:

— Шмат я гора перанесла за сваё жыццё. „Навучылася" ў паноў і кулакоў усякай чорнай рабоце і выносłівасці. Але за цяжкую работу толькі лаялі і білі. Работала нараўне з мужчынай, а атрымоўвала куды менш.

Толькі ў калгасе я ўбачыла шчаслівае і радаснае жыццё, якое нам дала наша партыя і правадыр народаў родны Сталін. Настала цяпер такое жыццё, якім трэба даражыць!

Чырвонапольскі сельсовет

К. Захарэвіч.

На здымку: Соня Гардон і Аля Бомштэйн у фота-лабараторыі Барысаўскай дзіцячай тэхнічнай станцыі пераглядаюць зняты імі негатыў.
(Белсаюзфота)

СПАБОРНІЦТВА ДВУХ ДАЯРАК

Дуня Мядзведзева і Фядося Карнішкова працуюць у розных калгасах розных сельсоветаў. Адна—у калгасе „Баец", Нікалаеўскага сельсовета, другая—у калгасе „Сілач", Даўжанскага сельсовета, але працуюць па адной і той-жа галіне: яны абедзве—даяркі.

Абедзве яны прачыталі выклік даярак Жухавіцкага раёна, Маскоўскай вобласці аб тым, каб надаіць 3000 літраў малака ад каровы звычайнай пароды. Абедзве парашылі змагацца на сваіх фермах за гэту-ж колькасць малака. У чэрвені месяцы яны заключылі дагавор на соцспаборніцтва. І пачалі змагацца за лепшы ўдой ад кароў звычайнай пароды, ад якіх больш 700 літраў малака не надаівалі.

Пачалі падкармліваць, лепш даглядаць, і ў выніку ўдой намнога павялічыўся. Так, Фядося Карнішкова за 7 месяцаў надаіла ад 10 кароў 13025 літраў малака, гэта значыць па 1300 літраў на кожную карову.

Не адстае ад Карнішковай і Дуня Мядзведзева. Яна за 7 месяцаў надаіла ад кожнай каровы па 1305 літраў.

Шаірка

Віцебскі раён.

„ПРЫДЗІЦЕ ПОТЫМ“

Шмат карыснага зрабіў Совет жонак ІТР мясакамбіната № 8 за час свайго існавання. Па ініцыятыве жонак былі агледжаны рабочыя кватэры і адпушчаны сродкі на іх рамонт. Яны з'яўляюцца агітатарамі і праваднікамі культуры ў цэхах, у рабочым быту. Пры іх актыўным удзеле арганізаваны пры медпункце зубаўрачэбныя габінеты і правялі шэраг іншых карысных мерапрыемстваў.

З боку рабочых яны сустракаюць цёплыя таварыскія адносіны. Рабочыя мясакамбіната ім вельмі ўдзячны за іх дапамогу ў арганізацыі іх быта, адпачынку, культуры ў цэхах.

Але не так аднесліся некаторыя кіраўнікі ўстаноў. Вось, напрыклад, інструктар дзіцячых садоў пры Гомельскім ГорАНА тав. Фрэйдзіна. Да яе прышлі з просьбай дапамагчы і ў арганізацыі дзіцячай пляцоўкі пры камбінаце і даць вопытнага кіраўніка. На гэта паследваў адказ:

— Нічым не магу вам дапамагчы.

Параіла Фрэйдзіна прыйсці праз некаторы час.

З таго часу часта хадзілі жонкі ў ГорАНА. Многа пахадзілі. Хацелі арганізаваць пляцоўку для дзяцей рабочых мясакамбіната. Многа патрацілі энергіі.

Аднойчы паследваў адказ: „Хутка вернуцца дзіцячыя сады з лагераў. Паасобнага работніка няма, але я ўладжу гэтае пытанне“. Запісала адрас і загадала: „Прыдзіце праз 2 тыдні“.

Праз 2 тыдні Фрэйдзіна адказала інакш: „З лагераў дзіцячыя сады вярнуліся, але ідзе рамонт, прыдзіце яшчэ праз два тыдні“. І ў тым-жа месяцы, толькі праз тыдзень (бо жонкі прышлі датэрмінова) аказалася, што ўжо як быццам позна, месцы ўжо запоўнены. Праўда, потым яна зноў абнадзеіла: Прыходзьце праз тыдзень“...

І, нарэшце, паследваў катэгарычны адказ: „нічога не магу зрабіць. Складайце спіс дзяцей, асабліва тых, якія маюць патрэбу ў дзіцячых садах, я іх прыму“.

Хутка спіс дзяцей быў складзен, з ім пашлі ў ГорАНА, Фрэйдзіна нават не паглядзела на спіс, не ўступіла і ў разгаворы, а наадрэз адмовілася прыняць дзяцей.

Сярдзюкоў

г. Гомель.

Кіраўніца дзіцячага сада завода „Большэвік“ (Менек) на прагулцы з дзецьмі 7 лістапада.

(Белсаюзфота)

МАЯ БУДУЧЫНЯ

— Дзяўчаты! Хто хоча вучыцца ў лётнай школе? — з такім запытаннем звярнуўся да нас сакратар комсамольскага камітэта тав. Брэгман.

Пачуўшы гэтыя словы, я не магла дачакацца, пакуль скончыцца рабочы дзень. Не давалі спакою думкі аб будучай вучобе ў лётнай школе, пра якую марыла, будучы яшчэ ў вясковай школе.

Настаў дзень адбора. Вельмі хваляваласа я, калі праходзіла медычную камісію, пасля розныя працэдуры. Нарэшце мне выдалі невялікую паперку, дзе было напісана чырвоным чарнілам: „Годна“. Ад радасці не ведала, што рабіць! На другі дзень я ўжо слухала першую лекцыю.

І вось я вучуся. Зараз мы праходзім курс палётаў на планеры, які хутка скончым, а там—самалёт...

Кожны дзень я адчуваю таварыскую дапамогу партыйнай і комсамольскай арганізацый фабрыкі. І таму спадзяюся скончыць лётную школу добра. Пасля—самастойныя палёты і далейшая вучоба.

Зараз я актыўна ўдзельнічаю ў абарончай рабоце. У лагерах ПВО ў гэтым годзе я здала нормы на значкі „ГТО“, „ПВХО“, „ГСА“ і „Варашылаўскага стралка“.

Я зусім маладая, поўна сіл і энергіі. Свае жаданні і мары ператвару ў жыццё, бо для гэтага маю ўсе магчымасці.

Сталінская Канстытуцыя адчыняе шырока дзверы ў яшчэ больш шчаслівае і радаснае жыццё для нашай моладзі. Права на працу, права на адпачынак і права на адукацыю—авалодваць вышынямі навукі—вось што нам гарантуе Сталінская Канстытуцыя. За гэта вельмі дзякуй нашаму роднаму і любімаму Сталіну!

Соня Марынкова

Віцебск, фабрыка імя Кагановіча

Усё, аб чым марылі людзі і снілі,
Прыбітыя гнётам, пракляццем старым,
У Совецкім Саюзе з'яўляецца быллю...
І нашае шчасце мы свету дарым.

(З пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну)

"БАБЫ"

Максім Горкі.

Цёплым летнім вечарам мы—я і стары прыяцель мой—сядзелі пад соснамі на пясчаным абрыве; пад абрывам—невялікі луг, ядавіта-зялёны пасля дажджу; на зелень луга кінута і павольна цячэ рыжая вада маленькай рэчкі, за рэчкай—цёмныя дрэвы, з правага боку ад нас, над кручамі воблакаў, цёмначырвонае вячэрняе сонца сцеле касыя праменні на рэчку, луг, залаты пясок абрыву.

Субяседнік мой закурыў, гледзячы на рэчку, і пачаў расказваць не спяшаючыся, удумліва:

— Было гэта гады два таму назад, у адным з маленькіх гарадоў вярхоўя Камы. Я сядзеў у павятовым камітэце партыі, бяседуючы „па душах" з старшынёй і сакратаром.

Была нядзеля, час—за поўдзень, на вуліцы горача, быццам у лазні, і—цішыня. За крышамі дамоў—гара, пакрытая футрай леса, адтуль у адчыненыя вокны цячэ запах смалы і горкі дымок: мабыць, недзе блізка вугаль паляць.

Бяседуем мы і ўжо пачынаем крыху сумаваць. Раптам з вуліцы, у адчыненае акно, паднімаецца ад гарачай зямлі вялікі, распараны дачырвана твар бабы, на ім неласкава і насмешліва блішчаць блакітна-шэрыя, залітыя потам вочы, цяжкі, густы голас гудзіць:

„Здарова жывеце!"

„Зноў чорт прынёс"—прабурчэў старшыня, пачэсваючы пад пахамі, а жанчына напаўняла пакой гудам папрокаў:

„Ну, што, таварыш Сямёнаў, падмануў ты мяне? Думаў: пагавару-з ёй па-разумнаму, яна і будзе сыта? А вось я зноў шасцьдзесят вёрст адтупала, на вось! Прымай госцю".

Твар яе знік з акна. Я спытаў, хто гэта. Старшыня матнуў рукой, сказаўшы:

„Так, шалая баба".

А сакратар з некаторым замяшаннем растлумачыў:

„Лічыцца кандыдаткай у партыю".

„Шалая баба" праціснулася ў дзверы з некаторай цяжкасцю. Была яна, скромна гаворачы, некалькі грамознай для жанчыны, вагой пудоў на шэсць, калі не больш, шырокаплечая, шырокабедрая, ростам — вяршкоў дзесяці звыш двух аршын. Паставіўшы ў кут тоўсты кій, яна рухам магутнага пляча скінула са спіны катомку, беражліва палажыла яе ў кут, выпрасталася і, гучна ўздыхнуўшы, падышла да нас, сціраючы пот з твару рукавом кофты.

„Яшчэ добры дзень! Грамадзянін або таварыш?"—спытала яна мяне, сядаючы на стул. Стул заскрыпеў пад ёю. Даведаўшыся, што я—таварыш, спытала яшчэ: „Ці не з Масквы будзеш?"—І калі я адказаў сцвярджальна, яна, не звяртаючы больш увагі на сваё начальства, выцягнуўшы з велізарнай пазухі кавалак скуры салдацкага ранца велічынёй з рукавіцу, хлопнула ім па стале, аднак не выпускаючы з рук, і, навальваючыся на мяне плячом, дзелавіта, напорыста загаварыла:

„Ну-ка, вось разбяры справыта нашы! Вось, глядзі: копія паперы з губпарткома—правільна? Гэта—яму загад,—кіўнула яна галавой на старшыню.—А гэта вось ён пісаў туды. Значыць, ёсць у мяне права гаварыць?

Мінут дзесяць яна неперарыўна карысталася гэтым правам, расказваючы аб кааператарах, якія „наўмысля не ўмеюць гандляваць", аб таварыстве па сумеснай апрацоўцы зямлі, якому кулакі перашкаджаюць рэарганізавацца ў калгас, аб таямнічай і нерасследаванай паломцы сепаратараў, аб мужах, якія б'юць жонак, аб процідзеянні жонкі старшыні сельсовета і папоўны-настаўніцы, арганізацыі ясляў, аб уцёках селькоракомсамольца, якога хацелі забіць, аб цэлым шэрагу маленькіх бытавых неладаў і драм, якія ўзнікаюць ва ўсіх глухіх кутках нашай краіны на глебе барацьбы за новы быт, новы свет.

Расказваючы, субяседнік мой паступова захапляўся і жыва дарысоўваў фігуру бабы, яе жэсты; адзначыў яе беражлівыя адносіны да насавой хусткі: яна два разы вынімала хустку з кішэні спадніцы, каб выцерці пот рукавом кофты.

— Потам ад яе несла, як ад каня,—сказаў ён.—Сакратар наліў ёй шклянку чаю:

„Пі, Анфіса!"

Але яна, жадна сербануўшы жоўценькага кіпятку, забыла ўзяць цукру, а ўзяўшы кавалак, пачала стучаць ім па стале ў такт сваёй узрушанай прамовы, а затым сунуўшы цукар у карман, узяла яшчэ кавалак і засаромілася:

„Ой, што я раблю!—Але і другі кавалак таксама машынальна схавала ў кішэню, а астыўшы чай выпіла залпам, быццам квас.—Налей яшчэ, таварыш Якаў!"

Субяседнік мой, таропка пакурваючы, працягваў:

— Яна высыпала на галаву мне столькі гэтых драм і неладаў бытавых, што я нават перастаў разумець „сувязь падзей" у хаосе гэтым. Адчуваю толькі што шасціпудовая Анфіса—істота зусім незвычайная новая для мяне, што мне трэба даведацца і зразумець, якім шляхам яна „дайшла да жыцця такога". Карацей кажучы, запрасіў я яе да сябе,—я астанавіўся ў агранома, старога прыяцеля майго. Запрасіў і за чаем падрабязнейшым чынам, да позняга вечара, мучыў яе распытваннямі. Перадаць каларыт яе апавядання я, зразумела, не магу, але сёе-тое ў памяці урэзалася мне амаль літаральна. Бацька ў яе быў партны-анучнік, хадзіў па вёсках, поўшубкі і кажухі шыў. Матка памерла, калі Анфісе споўнілася дзевяць год. Бацька дазволіў ёй скончыць царкоўна-прыходскую школу, потым завёз яе ў сяло на Каму, дзе ён жаніўся на ўдаве з двума дзяцьмі. У гэтых умовах Анфіса, зразумела, зноў стала „нянькай" дзя-

*) „Бабы"—апошняе апавяданне, напісанае нашым вялікім пісьменнікам незадоўга да смерці.

цей мачахі, батрачкай яе, а мачаха аказалася „бабачкай п'янай разгульнай", дый бацька не адставаў ад яе—любіў і выпіць і пасвяткаваць. Часценька гаварыў:

„Спяшацца няма куды,—на ўсіх мужыкоў кажухі не пашыеш". Анфісе мінула шаснаццаць год, калі бацька памёр, заразіўшыся сібірскай яззай, і пасля смерці бацькі гаспадарка мачыхі яшчэ цяжэй лягла на яе хрыбет.

„Быў у нас шабер, стары Мікола Уланаў, паляваннем зай маўся, а раней штэйгерам працаваў. Яго пародай прыціснула ў шахце, храмаў ён і лічылі яго не ў поўным розуме: пахмуры такі, на словы скупы, глядзеў на людзей няласкава. Жыў ён бабылём, ну, я яму іншы раз пасціраю, пашыю, дык ён стаў са мной мякчэйшым.

„Дарэ на,—кажа,—дзеўка, сілу траціш на пустое месца, на п'яніц тваіх. Да чужой сілы людзі ласыя, збалавалі іх багатыя. На ўсё дрэннае людзям ад багатых прыклад, ад іх увесь свет дрэннаму вучыцца".

Вельмі спадабаліся мне гэтыя яго словы-мыслі, бачу, што верна сказаў: сяло—багатае, а людзі жорсткія, жадныя і ўсе ў гразі жывуць. Пытаю Міколу:

„А што мне рабіць?"

„Шукай,—кажа,— мужа сабе. Ты дзяўчына здаровая, работніца добрая, цябе ў багаты дом возьмуць".

„Ну, я і ў тую пару не зусім дурная была, бачу, стары самжа туды гоніць, адкуль зваў. А першыя-та яго словы скрыла ў душы ўсё-такі".

Гэтую частку свайго жыцця яна расказала не вельмі ахвотна, з нядбайнай ухмылкай у вачах і халаднавата, нібы не пра сябе гаварыла, а пра старую таварышку, нецікавую і нават непрыемную ёй. А затым неяк раптам падабралася ўся, пастукала кулаком па калену, і вочы яе прыплюшчыліся, быццам гледзячы глыбока ўдаль.

„І вось прыехаў маткі брат, матрос волжскіх параходаў, мужык гадоў сорак—люты чалавек! Сястру жыва прыбраў да рук, выселіў яе з дзецьмі ў лазню, хату занова перабраў, прыстроіў да яе краму і пачаў гандляваць. І гандлюе, і купляе, і грошы ў доўг дае, трох каровў завёў, авечак, а зямлю багатаму кулаку Антонаву ў арэнду здаў. Я ў яго і страпка і прачка, і кароўніца—і тчы, і прадзі, і ва ўсе бакі глядзі. Рвуцца мае жылачкі, трашчаць косточкі. Ох, цяжка мне было! Бачыце, таварыш, якая кувалда, а да непрытомнасці даходзіла".

Яна засмяялася густым такім грудным смехам; дзіўны, не жаночы смех. Потым, абцёршы твар і рот хустачкай, уздыхнула глыбока:

„А яшчэ цяжэй стала, калі ён знянацку напаў на мяне дый абабіў. Хоць і пабілася я з ім, а не зладзіла—нездарова была ў той час, жаночым нездаровем. Вельмі прыкра было. Я кампанію вяла з хлапцом адным, з Несцеравым, добрай сям'і, небагатыя людзі, ціхія такія, двое братоў, Іван і Ягор. Жылі не дзелячыся. Ягор дзядзька хлапца,—удавец, ён потым партызанам быў, і белякі павесілі яго. Хлапца-та забілі ў першы год імперыялістычнай вайны, бацьку яго кулакі разарылі, таксама прапаў кудысьці. З усёй сям'і толькі Ліза засталася, цяпер яна прыяцелька мая, партыйная стала чацверты год. Яна ў 16-м годзе, разумніца, у Перм на завод пайшла, добра навучылася там. Ну, гэта ўжо я далёка наперад заскочыла. Ну, хацела я, значыць, пайсці, калі ідыёт гэты згвалціў мяне, і сабралася, а ён кажа:

„Куды пойдзеш? Пачпарта ў цябе няма. І не дам, на гэта ў мяне сілы хопіць. Жыві са мной, дурная, шкадаваць не будзеш. Вянчацца не стану, у мяне жонка ў Чыстаполі, хоць і з другім жыве, а ўсётакі вянчацца мне закон не дазваляе. Памрэ яна, абвянчаюся, вось бог сведка!"

Абрыдлы быў ён, ды пашкадавала я здуру гаспадарку: ужо вельмі многа сілы маёй укладзена было ў яе. У Несцеравых сям'я нібы як родныя былі мне. Пашкадавала, засталася. Няласкава была я з ім, агідны ён быў, дый нездароў ці што: жывем, жывем, а дзяцей няма. Бабы пасмейваюцца з мяне, а над ім яшчэ горш—дражняць яго; ён, зразумела, злуецца і крыўды свае на мяне спаганяе. Біў. Адзін раз закінуў за шыю лейцы дый павалок, ледзь не задушыў. А то паленам па патыліцы ўдарыў, добра, што ў мяне валос многа, а ўсё такі доўга без памяці ляжала Сысок на левай грудзі амаль скусіў, гнілы чорт, сысок-та і цяпер на нітачцы боўтаецца. Ну, ды што гэта ўспамінаць, мусіць і сам ведаеш, таварыш, як у сялянскім быце кажуць: „Не бяда, што падохне жана, быў-бы конь жывы". Пачалася разняшчасная гэтая вайна..."

Сказаўшы гэтыя словы, яна змоўкла, памахваючы хусткай у распалены твар свой, падумала.

„Разняшчасная, гэта я па прывычцы кажу, а думаецца мне, як быццам не так і зразумела, працоўны народ пацярпеў, аднак і карысці не мала ад вайны! Як пагналі мужыкоў, агалілі вёскі, бачу я, бабы лепш пачалі жыць, дружней. Спачатку галовы апусцілі, а потым бачыце—самі сабе гаспадыні, і грамадскасці стала больш у іх, хочаш не хочаш, а трэба адна другой дапамагаць Багацеі нашыя лютуюць, ой, як лютавалі! Было іх васьмёра, лічачы гаспадара майго, зразумела папы з імі, у нас—дзве царквы; ураднік—зяць Антонава, першага ў сяле па багаццю. І чаго толькі яны не рабілі з бабамі, салдаткамі, як толькі ні выціскалі сок з іх! На пайках аблічваюць, палонных сабе па гаспадарках разабралі. Нават сумна расказваць усё гэта. Прабавала я бабам, каторыя памаладзей, гаварыць: „Скардзьцеся!" Ну, яны мне не верылі. Жыву я сярод гаршчкоў ды плошак, падойнікаў ды карчаг, паглядваю на грабежніцтва, на распусту і ўсё часцей успамінаю старыковы словы; Уланава-та: „Багачы ўсяму дрэннаму прыклад". І такі сум! Пайшла-б куды, ды не бачу, куды ісці. Тут Лізавета Несцерава прыехала, нагу ёй абпаліла, на кастылі яна. Гаворыць мне:

(*Працяг у наступным нумары*).

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Мінск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1216 Тыраж 8240 Уп. Галоўліта № III—5450.
Здана ў набор 16/XI—36 г. Падпісана да друку 5/XII—36 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.

1103



ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

на 1 месяц — 40 кап.,
на 3 мес. — 1 р. 20 к.,
на 6 мес. — 2 р. 40 к,
на год — 4 р. 80 к.



Журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“

Выданне ЦК КП(б)Б

арганізуе работніц і калгасніц на барацьбу за выкананне рашэнняў партыі і ўрада.

Журнал паказвае лепшы вопыт работы стаханавак — работніц і калгасніц, шырока асвятляе культурна-бытавыя пытанні жыцця работніц і калгасніц і жонак рабочых.

Журнал змагаецца за ажыццяўленне ўказанняў т. Сталіна аб працоўнай жанчыне, за ўзняццё кваліфікацыі жанчын, арганізацыі іх вучобы і вылучэнне на кіруючую работу, за арганізацыю дзіцячых устаноў, за прадастаўленне адпачынку па цяжарнасці і падняцці культурнага ўзроўню мацеры як выхаваўцы новага пакалення.

„Работніца і калгасніца Беларусі“ з'яўляецца лепшым памочнікам у рабоце і вучобе работніц і калгасніц. Асвятляе работу выдатных жанчын-стаханавак — работніц і калгасніц. Журнал дапамагае кожнай работніцы, калгасніцы навучыцца работаць лепш і стаць стаханаўкай.

Журнал выходзіць два разы ў месяц з дадаткам выкрайк. жаночага і дзіцячага адзення.

Да гэтага нумара дадаецца ўкладка-выкрайка.

ЦАНА 20 кап.